# ПРАЛЕСКА

## Праграма выхавання і навучання ў яслях-садзе

*(Працяг. Пачатак у № 4.)*

## МАГЧЫМЫЯ АДХІЛЕННІ, ПРАФІЛАКТЫКА І КАРЭКЦЫЯ ФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ У ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

### Дадатак N 1

| Асноўныя напрамкі дыягностыкі | Магчымыя адхіленні ў фізічным развіцці | Прычыны адхіленняў | Дыферэнцыраваныя групы | Прафілактыка і карэкцыя |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Здароўе | Дзіця хварэе часта і працягла (больш за 4 разы ў год) | | | Уважлівы медыка-педагагічны аналіз прычын кожнага выпадку захворваемасці. Стварэнне псіхалагічнага і экалагічнага камфорту ў групе |
| | Дзіця хварэе часта, але адносна хутка папраўляецца | Аслаблены імунітэт, фізкультурна-аздараўленчы рэжым не адпавядае асаблівасцям арганізма дзіцяці; адсутнічае псіхалагічны камфорт; экалагічны дыскамфорт памяшканняў | Група дзяцей, якія часта і доўга хварэюць (ЧДХ) | Распрацоўка сістэмы фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў для групы ў цэлым з улікам дыферэнцыраваных груп здароўя (з абавязковым уключэннем індывідуальна-загартоўваючых працэдур) Стварэнне ўмоў для поўнага задавальнення патрабаванняў арганізма дзяцей у руху |
| | Дзіця хварэе эпізадычна (1-3 разы ў год) | Слабая прыстасавальнасць арганізма да рэзка пераменлівых умоў жыцця (скразняк, зніжэнне-павышэнне тэмпературы паветра); парушэнні ў псіхалагічным і экалагічным камфорце, неадпаведнасць фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў індывідуальным асаблівасцям арганізма | Група дзяцей, якія хварэюць эпізадычна (ЭХ) | Забяспечыць адзінства сістэмы фізвыхавання ў д/с і сям'і Індывідуальныя лячэбна-прафілактычныя меры па прызначэнню ўрача |
| Фізічнае развіццё | Завышаная вага | Няправільнае харчаванне, нізкая рухальная актыўнасць; захворванні | Групы дзяцей з завышанай вагой | Спецыяльна разлічанае харчаванне з улікам адхіленняў у фізічным развіцці (збалансаванае для дзяцей з завышанай вагой, узмоцненае для аслабленых і інш.) |
| | Заніжаны аб'ём грудной клеткі | Слабы мышачны карсет грудной клеткі, захворванні | з заніжаным аб'ёмам грудной клеткі | Павялічаны рухальны рэжым (для ўсіх груп) |
| | Заніжаны рост | Анатама-фізіялагічныя прычыны, малая рухомасць, дрэннае харчаванне; захворванні | з заніжаным ростам | Выкарыстанне спецыяльна падабраных для кожнай групы комплексаў фізічных практыкаванняў |
| | Агульнае нізкае фізічнае развіццё | Частыя працяглыя захворванні, дрэннае харчаванне, нізкая рухальная актыўнасць | з агульным нізкім фізічным развіццём | Выкарыстанне спецыяльна падабраных для кожнай групы комплексаў фізічных практыкаванняў |
| | Парушэнні паставы, плоскаступнёвасць | Слабы мышачны карсет, нізкая рухальная актыўнасць; вопратка, абутак, якія не адпавядаюць узроставым і індывідуальным асаблівасцям; частае знаходжанне ў позе, якая не адпавядае анатама-фізіялагічным асаблівасцям арганізма | з парушэннямі паставы (сутуласць, крутая спіна, скаліёз) і плоскаступнёвасць | Фарміраванне ў дзяцей навыкаў правільнай паставы, асаблівая ўвага да абутку і вопраткі, развіццё інтарэсу ў дзяцей да ўласнага здароўя, фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця |
| Рухальная актыўнасць | Маларухомасць | Адхіленні ў здароўі, слабыя рухальныя ўменні, адсутнасць умоў для рухаў, неадэкватны псіхалагічны клімат; дзіця ўжо прывыкла да маларухомасці | Групы дзяцей: - малой рухомасці | Стварэнне ўмоў для рухальнай актыўнасці (месца, час, спартыўна-гульнявы матэрыял, псіхалагічны настрой); актывізацыя рухальнай дзейнасці. Сумесная з выхавацелем рухомая гульня, заахвочванне, уцягванне ў сумесную дзейнасць з дзецьмі вялікай рухомасці |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Павышаная рухомасць, пры якой адзначаецца малая ўсвядомленасць або бязмэтнасць рухаў | Павялічаная нервовая ўзбуджанасць; сістэматычная незадаволенасць патрэбнасці ў рухах, недастатковыя рухальныя ўменні | - вялікай рухомасці | Спецыяльная індывідуальная работа па навучанню рухам. Стварэнне часовых, псіхалагічных, прадметна-гульнявых умоў для поўнага задавальнення біялагічнай патрэбнасці ў рухах; уцягванне ў сумесную дзейнасць з маларухомымі дзецьмі; спецыяльнае навучанне рухам, якія патрабуюць дакладнасці: стрыманасці, самакантролю, прасторавых арыентыровак (хада і бег па абмежаванай плошчы, кіданне ў цэль, усе віды лажання і да т.п.) |
| Фізічная падрыхтаванасць | Слабыя рухальныя ўменні ў цэлым. Поўная адсутнасць інтарэсу да асобных рухаў і слабыя навыкі Нізкае развіццё фізічных якасцей: спрытнасці, трываласці, сілы, хуткасці, кардынацыйных здольнасцей | Слабае здароўе, дысгарманічнасць фізічнага развіцця, дрэннае навучанне рухальным уменням, адсутнасць умоў для рухаў | Групы дзяцей:<br>- з агульным адставаннем у авалоданні рухамі;<br>- з адставаннем у авалоданні асобнымі рухамі;<br>- з нізкім развіццём фізічных якасцей | Стварэнне ўмоў для рухальнай дзейнасці на працягу ўсяго дня знаходжання дзіцяці ў д/с і сям'і, арганізацыя спецыяльнага індывідуальнага навучання рухальным уменням; карэкцыйная аздараўленчая работа, спецыяльныя практыкаванні для карэкцыі фізічнага развіцця і фарміравання фізічных якасцей |

# Дадатак N 2

## ДЫЯГНОСТЫКА І ПРАГНАЗІРАВАННЕ Ў ФІЗІЧНЫМ ВЫХАВАННІ

Агульнавядома, што поспехі ў аздараўленча-выхаваўчай рабоце магчымыя толькі тады, калі маецца поўнае ўяўленне аб стане арганізма дзіцяці, яго рэзервовых магчымасцях.

У гэтым выпадку можна ў адпаведнай ступені прагназіраваць і канчатковыя вынікі.

### АЦЭНКА ЗДАРОЎЯ

У індывідуальную медыцынскую карту дзіцяці рэгулярна ўносяцца дадзеныя аб яго фізічным развіцці, вызначаецца група здароўя. З гэтымі картамі працуюць медыкі. Выхавацелю ж патрэбны больш простыя і канкрэтныя характарыстыкі груп здароўя. Педагагічная дыягностыка здароўя праводзіцца па трох асноўных групах: 1) дзеці ні разу не хварэўшыя на працягу мінулага года (гэта галоўны паказчык здароўя); 2) эпізадычна хварэючыя (1-3 разы ў год); 3) дзеці часта хварэючыя (4 і больш разоў у год). Галоўнае прызначэнне педагагічнай дыягностыкі — стварыць аптымальныя ўмовы для жыцця і дзейнасці кожнага дзіцяці на аснове дыферэнцыяцыі. У гэтым выпадку з'яўляецца магчымасць элементарнага прагназіравання, таму што больш выразна прагледжваюцца асноўныя задачы па ўмацаванню здароўя ў кожнай з падгруп: выхавацель імкнецца перавесці дзяцей у вышэйстаячую групу здароўя, дабіцца ў цэлым павышэння індэкса здароўя (павелічэння колькасці нехварэючых дзяцей) і зніжэння колькасці часта хварэючых.

### ДЫЯГНОСТЫКА ФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Адна з важнейшых задач у фізічным выхаванні — забеспячэнне гарманічнасці фізічнага развіцця дзяцей. Дыягностыка тут пачынаецца з канстатацыі колькасці дзяцей у групе з гарманічным фізічным развіццём і з рознымі адхіленнямі. Найбольш трывожныя адхіленні сёння — завышаная вага, заніжаны аб'ём груднай клеткі, заніжаны рост, агульнае нізкае фізічнае развіццё, парушэнні ў паставе і ступні.

### РУХАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЗЯЦЕЙ

ацэньваецца па двух аспектах: узроўню рухальнай актыўнасці (РА) і ступені развіцця рухальных уменняў і фізічных якасцей.

Правесці такі дакладны аналіз няпроста — патрэбны і спецыяльныя веды, і сумесная праца многіх работнікаў. Затое складзеная аб'ектыўна дыягнастычная карта дае выхавацелю align рознабаковую характарыстыку здароўя, фізічнага і рухальнага развіцця дзяцей, свайго роду індывідуальныя прагназіруючыя праграмы клопату аб кожным дзіцяці і групе ў цэлым. Такая карта можа разглядацца як перспектыўны план індывідуальнай работы з дзецьмі, які заўсёды перад вачыма, дакладны і наглядны.

Адпадае неабходнасць спецыяльнага фармальнага планавання індывідуальнай работы. Вельмі важна тое, што карта накіроўвае на канчатковы вынік у фізічным выхаванні. Дадзеныя на пачатку і ў канцы года наглядна паказваюць дынаміку (або яе адсутнасць) у здароўі, фізічным і рухальным развіцці дзяцей. З'яўляецца магчымасць аб'ектыўнай ацэнкі работы педагогаў па канчатковых выніках, што павышае іх адказнасць, стымулюе пошук найбольш эфектыўных прыёмаў аздараўлення дзяцей. На аснове дадзеных дыягностыкі з'яўляецца магчымасць вызначаць прыярытэтныя задачы ў арганізаваных формах фізкультурнай працы ў цэлым.

# Дадатак N 3

## ДЫЯГНАСТЫЧНАЯ КАРТА ЗДАРОЎЯ, ФІЗІЧНАГА І РУХАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ ГРУПЫ

| Прозвішча, імя дзіцяці | Здароўе | | | | | | Фізічнае развіццё | | | | Рухальнае развіццё | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | верасень 1994 | | | верасень 1994 | | | верасень 1994 | | верасень 1994 | | верасень 1994 | | | верасень 1994 | | |
| | ЗД | ЧХ | ЭХ | ЗД | ЧХ | ЭХ | Гарм. | Адх. | Гарм. | Адх. | РА | Здольн. | Адс. | РА | Здольн. | Адс. |

**Умоўныя адзнакі:** ЗД — здаровыя, ні разу не хварэўшыя на працягу года
ЧХ — часта хварэючыя дзеці (больш за 4 разы ў год)
ЭХ — эпізадычна хварэючыя (1-3 разы ў год)
Гарм. — гарманічнае фізічнае развіццё
Адх. — адхіленні ў фізічным развіцці, завышаная вага, заніжаны аб'ём грудной клеткі і рост, агульнае нізкае фізічнае развіццё, парушэнне паставы, плоскаступнёвасць
РА — рухальная актыўнасць ва ўмоўных кроках
Здольн. — здольнасць да асобных відаў рухаў і фізічных практыкаванняў
Адстав. — адставанне ў авалоданні рухальнымі ўменнямі

*Дадаткі падрыхтавала*
*В. А. ШЫШКІНА, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Дадатак N 4

## ПРАФІЛАКТЫКА І КАРЭКЦЫЯ АСОБЫ І ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-ВАЛЯВОЙ СФЕРЫ (група "Маляты")

| Прадмет карэкцыі | Магчымыя адхіленні ў развіцці, іх сімптомы | Асноўныя накірункі прафілактыкі і карэкцыі | Магчымыя вынікі карэкцыйнай працы |
|---|---|---|---|
| Вобраз "Я" дзіцяці | Затрымка ў развіцці самасвядомасці; гаворыць пра сябе ў трэцяй асобе<br>Цяжкасці ў палавой ідэнтыфікацыі; дзіця не ўмее выказаць у мове сваю палавую прыналежнасць (у хлопчыкаў — выкарыстанне дзеясловаў жаночага роду) | Разнастайнасць кола зносін дзіцяці; увядзенне ў яго мужчын; актывізацыя кантактаў з прадстаўнікамі свайго полу, тлумачэнне адрозненняў, выяўленне ў мове палавой прыналежнасці | Гаворыць пра сябе ў першай асобе, у правільным родзе |
| | Негатыўнае ўяўленне дзіцяці пра сябе | Аптымізацыя зносін, выражэнне шчырай зацікаўленасці ў дзіцяці, акцэнтаванне ўвагі на яго поспехах; стварэнне ўмоў для набыцця станоўчага вопыту дзіцяці ў дзейнасці і зносінах; фарміраванне ўпэўненасці ў сабе, усведамленне асабістай паўнацэннасці | Змяненне ўяўлення дзіцяці пра сябе, пазітыўнае самаўспрыманне, узнікненне пачуцця гонару |
| Нізкі ўзровень патрэбнасці дасягнення поспеху | Незадавальненне патрэбнасці ў самарэалізацыі; нізкія прэтэнзіі. Дзіця безыніцыятыўнае, пасіўнае, характэрная адсутнасць перажыванняў няўдачы ў дзейнасці. Самадзейнасць суправаджаецца праяўленнем нярэдка няўпэўненасці ў сваіх сілах, бояззю няўдачы, паражэння, стратай цікавасці да прадметаў і дзеянняў з імі | Фарміраванне самастойнасці і цікавасці да даступнай дзейнасці; аказанне дапамогі ў авалоданні ёю. Праяўленне цікавасці да дзіцячай дзейнасці, зняцце (змяншэнне) забаронаў, дапамога ў дасягненні станоўчых вынікаў, ухваленне поспеху ў дзейнасці і прыкладзеных намаганнях. Заахвочванне дзейнічаць спачатку з дарослымі, затым самастойна. Аптымізацыя эмацыянальных і дзелавых зносін | Павышэнне ўзроўню дамагання; не баіцца няўдач, праяўленне самастойнасці, цікавасці да прадметнай дзейнасці |
| Дэпрывацыя патрэбнасці ў зносінах | Эмацыянальная беднасць: цяжкасці ўстанаўлення кантактаў з раўнагодкамі, нежаданне ўступаць у іх, не складваюцца выбарачныя зносіны, не глядзяць у вочы адно аднаму, засяроджваюць увагу на руках раўнагодкаў і г.д. | Аптымізацыя зносін, узмацненне кантакту вачэй, тактыльнага кантакту, актывізацыя эмацыянальна-асобасных зносін, праяўленне зацікаўленасці ў дзіцяці, уступленне ў дзелавыя зносіны, навучанне сродкам зносін | Павышэнне інтарэсу ўзаемадзеяння з дарослымі і раўнагодкамі, узнікненне жадання да сумеснай дзейнасці з імі, авалоданне элементарнымі формамі і сродкамі зносін з дарослымі і дзецьмі |
| Цяжкасці адаптацыі да дзіцячай установы. Адрыў ад сям'і, змяненне ўмоў жыцця, выхавання, зносін | З цяжкасцю ідзе на кантакт з выхавацелем, з мамай расстаецца з плачам, не ўступае ў кантакты, пазбягае дзяцей, адхіляе спробы дарослых да збліжэння, абыякавы да новых абставін<br>Магчымы амбівалентныя дваякія адносіны да дзяцей, страх перад новымі дарослымі і дзецьмі. Не можа ўстанавіць кантакты з раўнагодкамі. Супраціўляецца новаму рэжыму | Асаблівая ўвага да дзіцяці ў час прыёму ў дзіцячым садзе<br>Папярэдняе знаёмства з сям'ёй дзіцяці. Актывізацыя эмацыянальна-асобасных зносін (пяшчотныя і чуллівыя дотыкі да розных частак цела, ласкавы зварот па імю, да якога прывыкла дзіця, устанаўленне цёплых, эмацыянальных адносін, стварэнне пачуцця бяспекі, абароненасці, эмацыянальнага камфорту). Уступленне ў дзелавыя зносіны з дзіцём, навучанне спосабам узаемадзеяння з акружаючымі | Зніжэнне трывожнасці пры расставанні з бацькамі, спакойнае расставанне з імі. Праяўленне даверу да выхавацеля, узнікненне цікавасці да новага асяроддзя, адсутнасць неспакою на працягу дня, здольнасць да дзелавога супрацоўніцтва |
| Актыўныя формы валявой недастатковасці | Негатывізм, упартасць | Прадастаўленне свабоды выбару, навучанне спосабам дзеянняў і паводзін, зносіны — супрацоўніцтва з дарослымі | Самастойнае матываванае дзеянне, супрацоўніцтва з дарослымі |

*Дадатак падрыхтавалі:*
*Г.М. БЕЛАУС, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт,*
*Н.А. ЦЫРКУН, кандыдат псіхалагічных навук*

# Дадатак N 5

## ПРАФІЛАКТЫКА І КАРЭКЦЫЯ АДХІЛЕННЯЎ У РАЗВІЦЦІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ СФЕРЫ (група "Маляты" — 2-3 гады)

| Прадмет карэкцыі | Магчымыя адхіленні ў развіцці пазнавальнай сферы | Прычыны адхіленняў | Прафілактыка і шляхі карэкцыі адхіленняў | Паказчыкі паспяховасці карэкцыйнай працы |
|---|---|---|---|---|
| Пазнавальная актыўнасць | Агульнае зніжэнне пазнавальнай актыўнасці, адсутнасць цікавасці да навакольнага, вяласць, інертнасць, няўменне задаваць простыя пытанні (хто гэта? што гэта?), цяжкасць пераносу ўвагі з аднаго аб'екта на другі, пераходу ад аднаго дзеяння да другога, павольнае ўключэнне ў пазнавальна-практычную дзейнасць (абмежаванне пасіўным сузіраннем, простым маніпуліраваннем), адсутнасць эмацыянальных адносін да даследчай і прадметнай дзейнасці, нуда, перавага простых арыенціровачна-пазнавальных дзеянняў, а таксама неспецыфічнага маніпуліравання (дзеянняў з прадметамі, якія не ўлічваюць іх характэрных асаблівасцей)<br>Адсутнасць цікавасці да адзнакі дарослага, патрэбнасці толькі ў станоўчай адзнацы, поўная адсутнасць перажыванняў няўдачы ў дзейнасці | 1. Псіхафізіялагічныя індывідуальныя асаблівасці, слабасць, інертнасць нервовай сістэмы<br>2. Агульнае аслабленне арганізма, саматычныя захворванні<br>3. Псіхічная дэпрывацыя, дэфіцыт зносін з дарослымі, які не дазваляе дзіцяці пераадолець пасіўна-абарончы рэфлекс, што ўзнікае ў сітуацыі навізны. Узнікненне нясмеласці, страху, незадавальнення, калі бачыць новыя цацкі, новыя бытавыя прадметы, новую ежу і г. д.<br>4. Сенсорная дэпрывацыя (абмежаванне сенсорных раздражняльнікаў у натуральных умовах жыцця і дзейнасці, аднастайнасць прадметнага асяроддзя) | Устанаўленне цёплых эмацыянальных кантактаў з дарослымі, зняцце псіхалагічнага напружання, стварэнне абставін псіхалагічнай абароненасці<br>Падтрымка цікавасці да новага, паказ і стымуляванне спецыфічных дзеянняў, вызначаемых фізічнымі уласцівасцямі прадметаў, пашырэнне дыяпазону спецыфічна-культурных дзеянняў з прадметамі, якія выпрацаваны дарослымі і даведацца аб якіх дзіця можа з дапамогай дарослых<br>Практычнае супрацоўніцтва дзіцяці з дарослым, суправаджэнне ўсіх дзеянняў моўным каментарыем, усмешкай<br>Паказ гульнявых дзеянняў, стварэнне гульнявых сітуацый. Ацэнка дзіцячых дасягненняў адабрэннем, пахвалой, гульнявае стымуляванне, дзейнасць | Павышэнне ўзроўню пазнавальнай актыўнасці, павелічэнне цікавасці да навакольнага, з'яўленне пытанняў: "Што гэта?". Пераход ад спецыфічных прадметна-прыладных дзеянняў да дзеянняў арыгінальных, незвычайных. Суправаджэнне пазнавальнай дзейнасці бурнымі станоўчымі пачуццямі — радасцю, захапленнем, задавальненнем<br>З'яўленне ўстойлівых эмацыянальна-станоўчых адносін да прадметаў, пераход ініцыятывы ў выкананні дзеянняў да дзіцяці, змяненне матывацыі сумеснай дзейнасці<br>З'яўленне імкненняў рэалізаваць сваю задуму не любым, а спосабам, які сацыяльна ўхваляецца |
| Сенсорыка | Спазненне ў развіцці дыферэнцыраванай адчувальнасці, што ўскладняе засваенне простых сенсорных эталонаў (асноўных колераў, формы, смаку новых прадуктаў і інш.)<br>Затрымка ў развіцці перцэптыўных дзеянняў: разглядання, абмацвання, прыслухоўвання, дэгустацыі (смаку, пахаў...) і г. д.<br>Частковае спазненне развіцця сенсорных здольнасцей:<br>— здольнасці рабіць прасторавыя і сенсорныя дыферэнцыроўкі (пазнаваць і дыферэнцыраваць простыя геаметрычныя фігуры, выяўляць паміж імі падабенства і розніцу);<br>— здольнасці выконваць мэтазгодныя дзеянні, сістэму дзеянняў па дасягненню канкрэтнага выніку;<br>— здольнасці знаходзіць і выпраўляць памылкі | Сенсорная дэпрывацыя і недастатковая колькасць сенсорных стымулаў ці іх абмежаваная зменлівасць і варыятыўнасць (беднасць, аднастайнасць прадметнага асяроддзя, цацак, аднастайнасць ежы і г. д.);<br>ці, наадварот, занадта хаатычная структура знешняга свету (бязладнасць, хуткая дынаміка ўражанняў);<br>недастатковасць рухаў, дотыкаў | Абарона слыху і зроку дзіцяці (рэгуляцыя сілы раздражняльнікаў)<br>Стварэнне ўмоў для дастатковага паступлення зрокавых, слыхавых, тактыльных, смакавых і інш. раздражняльнікаў (праз бытавую дзейнасць, прыроду, мастацтва)<br>Развіццё здольнасцей рабіць прасторавыя і сенсорныя дыферэнцыроўкі; устанаўліваць падабенства і розніцу прадметаў па форме, велічыні, колеру і г. д.;<br>развіццё тактыльнай адчувальнасці;<br>разумець спецыфічныя функцыі і значэнне прадметаў;<br>выконваць разумныя дзеянні і сістэмы дзеянняў з прадметамі быту (збіранне пірамідак, складанне розных па форме і памеру цыліндраў, кубікаў, матрошак і інш. адзін у адзін ці складанне з іх высокіх і доўгіх фігур) | 2-2,5 г. Дзіця выконвае самыя простыя заданні на размяшчэнне асноўных геаметрычных фігур у ячэйках адпаведнай формы, укладвае адзін прадмет у другі, пры гэтым дзейнічае шляхам спроб і памылак, будуе рад большы, меншы, па колеру, па форме<br>2,5-3 гады. Дзіця пераймае бытавыя дзеянні дарослых з прадметамі<br>Самастойна есць, п'е з кубка, апранаецца і можа развязваць шнуркі, зашпільваць гузікі), сам надзявае шкарпэткі, штонікі, туфлі (не блытае правы і левы), выконвае бытавыя дзеянні — паварочвае ручку дзвярэй, націскае на кнопку званка, падымае трубку тэлефона, гартае кнігу (кожны ліст асобна), засвойвае шэраг лагічна звязаных дзеянняў<br>3 гады. Знаходзіць і выпраўляе памылкі пры выкананні заданняў на сенсорную і прасторавую дыферэнцыроўку, пераходзіць ад шляху спроб і памылак да зрокавага параўнання. Камбінуе ўжо вядомыя дзеянні для дасягнення мэты |
| Памяць і ўвага | Абмежаванасць і беднасць уяўленняў памяці, іх размытасць, адрывістасць, выпадковасць. Маруднае запамінанне і хуткае забыванне, пастаяннае адцягненне ўвагі, рассеянасць, зніжэнне цікавасці да акаляючага свету. Адсутнасць пераносу вопыту ў новыя ўмовы | Недастатковасць уражанняў, аднастайнасць бытавога абсталявання, абмежаванне зносін з дзецьмі, хранічныя захворванні, парушэнне рэжыму, хаатычнасць уражанняў, абыякавасць, няўменне знайсці сабе цікавы занятак, няправільная пазіцыя дарослых (адабрэнне ўяўнага поспеху ад механічнага запамінання і адсутнасць працы, накіраванай на развіццё разумення назваў і прызначэнняў прадметаў, іх якасцей і функцый, узаемасувязі з'яў і прадметаў і г. д.) | Падтрымліваць цікавасць да акаляючага, звяртаць увагу дзіцяці на новыя аб'екты, заахвочваць да назірання за перамяшчэннем (машын, жывёл, людзей...). Называць тое, што дзіця ў дадзены момант успрымае. Фіксаваць увагу на асноўных уласцівасцях, асаблівасцях, змяненнях<br>Узбагачаць пачуццёвы вопыт дзіцяці, задавальняць патрэбнасць ва ўражаннях, фарміраваць уяўленні аб з'явах прыроды, жыцці жывёл, аб працы дарослых, часавых і прасторавых адносінах, прызначэнні прадметаў, г. зн. напаўняць міжвольную, вобразную памяць дзіцяці пэўным зместам. Улічваць інтарэсы дзіцяці, разнастаіць яго дзейнасць, заахвочваць актыўную дзейнасць, накіраваную на вырашэнне пазнаваўчых задач, звязваць з непасрэдна ўспрымаемым мінулым вопытам | Малыш лёгка запамінае тое, што яму цікава (яскравае, тое, што рухаецца, змяняецца, новае, тое, з чым ён дзейнічае з захапленнем, разглядае, складае, разбірае, будуе, малюе...), тое, што шмат разоў паўтараецца<br>Імкнецца ўключыць дарослага ў сумесную прадметна-пазнавальную дзейнасць шырокага плана, неабмежаваную бытавымі ўзаемадзеяннямі, звяртаецца да дарослага за ўзорам спосабаў дзеяння (мае патрэбу ў шматразовым паўтарэнні, паказе), за адабрэннем у сувязі з дасягнутым вынікам. Пераход ад прадметна-практычнай памяці да памяці знешне апасродкаванай (міжвольнай), якая абапіраецца на знешнія сродкі (словы, гульнявае дзеянне, рытм, форму, відарыс і т.п.) |



(Працяг на стар. 29.)